# Даследаванні Н. У. Сліж па гісторыі сексуальных стасункаў у Вялікім Княстве Літоўскім

*Даўматовіч К. Д., студ. III к. БДУ,*
*нав. кір. Падалінскі У. А., канд. гіст. навук., дац.*

На сучасным этапе беларускай гістарыяграфіі навукоўцамі распрацавана шмат розных праблем з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Аднак і на дадзены момант ёсць тэмы, якія толькі паступова кладуцца пад пяро даследчыкаў. У рамках гісторыі паўсядзёнасці такой праблемай з’яўляюцца сексуальныя стасункі ў ВКЛ. Важную ролю ў вывучэнні гэтай тэмы адводзяць беларускаму гісторыку Наталлі Уладзіміраўне Сліж. Мэта дадзенага артыкула — паказаць уклад Н. У. Сліж у развіццё даследаванняў сексуальнай праблематыкі ВКЛ у беларускай гістарыяграфіі.

У асноўных працах Н. У. Сліж дадзеная тэма разглядаецца ў час XVI–XVII стст., але ёсць артыкул, у якім перыяд абазначаны да XVIII ст. [1; 2; 3; 4; 5]. Праблемай, якая значна абмяжоўвае даследаванне сексуальнай тэматыкі ранейшага часу (XIII–XV стст.), з’яўляецца недахоп гістарычных крыніц. Перыяд XVI–XVII стст. больш багаты на крыніцы, але некаторыя аспекты сексуальнай тэматыкі немагчыма раскрыць больш-менш поўна на дадзены момант (напрыклад, сексуальныя стасункі сялян) [5, с. 8–9]. Асноўную ўвагу Н. У. Сліж надае шляхецкаму саслоўю па прычыне большай крыніцазнаўчай базы.

У 2001 г. пад аўтарствам Н. У. Сліж выйшаў артыкул пад назвай «Сексуальнае жыццё шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст.». У дадзенай працы аўтар разглядала фактары, якія ўплывалі на развіццё сексуальных адносін паміж шляхтай (Рэнесанс, Рэфармацыя, развіццё прававой думкі ў ВКЛ, увогуле гістарычныя працэсы XVI–XVIII стст.) [4, с. 141, 146]. Таксама Н. У. Сліж на падставе гістарычных крыніц прыводзіць шэраг прыкладаў падобных стасункаў у асяроддзі шляхты ВКЛ. Але гэта быў толькі пачатак, далей даследчыца больш увагі надала асобным бакам сексуальнага жыцця ў Вялікім Княстве [4].

Так, у адной з прац Н. У. Сліж разглядаецца прававы аспект сексуальных адносін у ВКЛ. Таксама закранаецца значная грамадская праблема ў XVI–XVII стст., якая актуальна і для сучаснасці, — сексуальнае згвалтаванне. У артыкуле паказаны замежныя ўплывы на развіццё прававой думкі па пытаннях згвалтавання праз пранікненне Магдэбургскага права, а таксама роля Статутаў ВКЛ, асабліва ў практыцы правапрымянення [2, с. 93]. Таксама ілюструецца шэраг прыкладаў падобных судовых разбіральніцтваў нават сярод мяшчанскага насельніцтва [2].

Важным аспектам даследаванняў Н. У. Сліж з’яўляецца разгляд забароненых і ненатуральных сексуальных стасункаў у ВКЛ. У дадзеным выпадку даследчыцай падкрэсліваецца фактар патрыярхальнага грамадства

XVI–XVII стст., царквы і яе ўплыў на заканадаўчую сферу па акрэсленых пытаннях [1, с. 247–248]. Вызначаецца шэраг забароненых сексуальных стасункаў: нявенчаны шлюб, дашлюбныя стасункі, стасункі паміж сваякамі, бігамія, пералюб [1, с. 248, 250, 252, 254, 255]. Адзначаецца негатыўнае стаўленне грамадства ВКЛ да гомасексуальных, лесбійскіх і скоталожніцкіх сувязяў [1, с. 259, 264]. У дадзеным артыкуле значная ўвага нададзена практыцы падобных стасункаў у сялянскім асяроддзі, але даследчыца не абыходзіць увагай таксама шляхту і мяшчан [1].

Асобна Н. У. Сліж разглядала тэматыку прастытуцыі ў ВКЛ. У сваім артыкуле яна падкрэслівала патрэбу ў дадзеных паслугах сярод мужчынскага насельніцтва, што і дазваляе існаваць прастытуцыі праз стагоддзі [3, с. 144]. Даследчыцай паказваецца роля Статутаў у спробе вырашэння шэрагу сацыяльных праблем з-за існавання прастытуцыі як грамадскай з’явы [3, с. 115]. Таксама адзначаецца роля гарадоў як цэнтраў канцэнтрацыі дамоў распусты (напрыклад, Вільні) [3, с. 120].

Працяглая праца Н. У. Сліж па праблеме сексуальных стасункаў у ВКЛ прывяла даследчыцу да выдання ў 2019 г. асобнай манаграфіі па гэтай тэматыцы. У ёй, акрамя вышэй акрэсленых праблем, даследчыца звяртае ўвагу на медыцынскія і фізіялагічныя бакі сексу (палавыя хваробы, метады кантрацэпцыі) [5, с. 84–118]. Таксама Н. У. Сліж абазначае практычны аспект сексуальных стасункаў (позы, тэхнікі, месца) [5, с. 119–148]. У манаграфіі ўжываецца тэрмін «старабеларускі секс» для абазначэння культурнага феномена ў гісторыі ВКЛ [5, с. 10, 119]. Такім чынам, Н. У. Сліж сваімі працамі па сексуальнай праблематыцы абазначае незвычайны накірунак для далейшага вывучэння гісторыі Беларусі.

### Літаратура

1. Сліж, Н. У. Забароненыя і ненатуральныя сексуальныя стасункі ў ВКЛ у XVI–XVII стст. / Н. Сліж // Вялікае Княства Літоўскае палітыка, эканоміка, культура : зб. нав. арт. — Мінск : НАН Беларусі, Ін-т гісторыі, 2017. — С. 247–266.

2. Сліж, Н. У. Згвалтаванні ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII ст. заканадаўства і судовая практыка / Н. Сліж // Соціум. Альманах соціальної історії. — К. : Інститут історії України, 2015. — Вип. 11–12. — С. 91–103.

3. Сліж, Н. У. Прастытуцыя ў Вялікім княстве Літоўскам у XVI–XVII стст. / Н. Сліж // Соціум. Альманах соціальної історії. — К. : Інститут історії України, 2017. — Вип. — 13–14. — С. 113–126.

4. Сліж, Н. У. Сексуальнае жыццё шляхты Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. / Н. Сліж // Terra Alba. Homo venerus Сексуальная прастора беларускай культуры. — Мінск : Экаперспектыва, 2001. — Т. 2. — С. 138–166.

5. Сліж, Н. У. Культура сексуальных стасункаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. / Н. У. Сліж. — Мінск : Тэхналогія, 2019. — 231 с.